**А.Л. Смолік (Мінск)**

# МУЗЕЕФІКАЦЫЯ ПОМНІКАЎ КУЛЬТУРЫ ЗАХОДНЯГА ПААЗЕР'Я: ПРАБЛЕМЫ, ТЭНДЭНЦЫІ

Культурна-гістарычная прастора Паазер'я, або Падзвіння, займае большую частку Віцебшчыны. Гэта значны гісторыка-этнаграфічны рэгіён нашай краіны, які налічвае шмат унікальных помнікаў матэрыяльнай і духоўнай культуры. Практычна ўсе эпохі жыццядзейнасці чалавека на тэрыторыі Беларусі — ад старажытнасці да нашага часу — знайшлі тут сваё адлюстраванне. У дадзеным рэгіёне захавалася шмат археалагічных помнікаў (гарадзішчы, курганныя могільнікі), архітэктурных ансамбляў XVIII — XIX стагоддзяў, помнікаў культавага дойлідства X (Пастаўскі касцёл Св. Антонія Падуанскага, Лучайскі касцёл Св. Тадэвуша, Глыбоцкі Троіцкі касцёл і інш.). З гэтымі мясцінамі звязана шмат імёнаў выдатных дзеячаў культуры і мастацтва, гістарычных асоб (Корсакі, Масальскія, Сапегі, Тызенгаўзы і інш.). Усё гэта знайшло пэўнае адлюстраванне ў «Збору помнікаў гісторыі і культуры Віцебскай вобласці» [3]. Асаблівасці палітычнага, сацыяльна-эканамічнага развіцця Падзвіння абумовілі адметнасць яе традыцыйнай культуры. Вялікая колькасць культурна-гістарычных каштоўнасцей знаходзіцца ў так званых мястэчках (малых гарадах). На працягу мінулых стагоддзяў помнікі Заходняга Паазер'я падвяргаліся пастаяннаму антрапагеннаму ўздзеянню, мноства іх былі пашкоджаны і разбураны пры гаспадарчай дзейнасці. Шэраг помнікаў культуры назаўсёды страчаны, пэўная частка іх разбураецца альбо знаходзіцца ў дрэнным тэхнічным становішчы. Інфармацыя аб загубленых помніках утрымліваецца ў калектыўнай манаграфіі «Страчаная спадчына» [4]. Таму захаванне, аднаўленне і рацыянальнае выкарыстанне помнікаў традыцыйнай культуры з'яўляецца актуальнай праблемай дзяржавы і грамадскасці, якая патрабуе неадкладнага вырашэння. Безумоўна, большасць помнікаў Заходняга Паазер'я дасканала вывучана і даследавана беларускімі і замежнымі навукоўцамі. Значная колькасць іх захоўваецца ў архівах, бібліятэках і іншых сацыякультурных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

установах. Але вялікая колькасць азначаных помнікаў не ахоплена працэсам музеефікацыі. Ахова, кансервацыя, рэстаўрацыя і іншыя формы музеефікацыі дазволяць спыніць разбурэнне і іх страту. На наш погляд, да культурна-гістарычнай прасторы Заходняга Паазер'я неабходна падыходзіць як да цэласнай сістэмы, элементы якой узаемадзейнічаюць паміж сабою. Гэта дазволіць наблізіцца да рэалізацыі вырашэння комплекснага ўспрыняцця і функцыяніравання помнікаў культуры і гісторыі.

Гарады і мястэчкі Заходняга Паазер'я ўяўляюць сабой сінтэз дойлідства розных гістарычных эпох, прыродных элементаў, злучаных у прасторавую сістэму вуліц і плошчаў, культавых, грамадскіх, жылых, вытворчых будынкаў і малых архітэктурных форм. Найбольш цікавымі ў гэтых адносінах з'яўляюцца Браслаў, Глыбокае, Дзісна, Друя, Мосар, Паставы. Акрамя таго ў разглядаемым рэгіёне маецца пэўная колькасць сядзібных комплексаў: Відзы-Лаўчанская, Варапаеўская, Лынтупская, Норыцкая, сядзібы ў Асвеі, Бяльмонтах, Лявонпалі. Шкада, але сёння сядзібы істотна змяніліся. Парушана іх прасторавая арганізацыя, часцей за ўсё страчаны палацы, сядзібныя дамы, малыя архітэктурныя формы, змяніўся склад паркавых насаджэнняў, перасталі функцыяніраваць водныя сістэмы. Найбольш шкоднай для сядзібных помнікаў з'яўляецца сучасная забудова, дарэчы, якая наогул не павінна весціся на культурна-гістарычнай прасторы. На значнай частцы культурнай прасторы сядзіб у выніку гаспадарчай дзейнасці адбыліся змены навакольнага асяроддзя, што парушыла візуальныя сувязі з прыродным ландшафтам, прывяло да страты відавых перспектыў. Праўда, сёння маецца канцэпцыя аховы культурнага ландшафту, што, спадзяёмся, будзе садзейнічаць захаванню наваколля сядзібных помнікаў. Адмоўна адбіваецца на стане асобных сядзіб адсутнасць узаконеных ахоўных межаў. Да нядаўняга часу іх не мелі Германавіцкая, Лынтупская, Дзіўная, Камянапольская і іншыя сядзібы. Шэраг названых помнікаў даўно не рамантаваліся, а найбольш значныя не зведалі рэстаўрацыі і кансервацыі: Асвейскі палац, Лявонапольская сядзіба, сядзібны дом у Камянаполі. Між тым, на гэтым мінорным фоне ёсць прыклады разумнага прыстасавання да новага функцыянальнага выкарыстання сядзібных будынкаў. Так, у Паставах сядзіба выкарыстоўваецца пад бальніцу, у Глыбокім — як адміністрацыйны будынак, у Германавічах раз-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мешчана школа, у Відзах-Лаўчанскіх — навучальная ўстанова. Такім чынам, пры жаданні і разуменні сапраўднай культурнай каштоўнасці сядзібных помнікаў можна іх захаваць, даць другое жыццё і выкарыстоўваць для эстэтычнага выхавання суб'ектаў соцыуму. У апошні час адноўлены шэраг сядзіб: Бігосаўская, Азерская, палац Тызенгаўзаў, паркі ў Варапаеве, Норцы, Асвеі. Асобныя сядзібы сталі цэнтрамі сучасных фермерскіх гаспадарак. Пры гэтым сельскагаспадарчыя прадпрыемствы з улікам гістарычнага характару аб'екта набываюць новую функцыю, яны ажыццяўляюць турыстычную дзейнасць. Могуць быць і іншыя накірункі прыстасавання сядзіб. На іх аснове могуць стварацца турыстычныя цэнтры, дамы творчасці, музеі, гасцінічныя комплексы, прафілакторыі і г.д.

Мала вывучанымі да апошняга часу застаюцца культавыя валуны і каменныя крыжы. А яны ўяўляюць сабой каштоўнейшыя крыніцы культуры, палеаграфіі і мастацтва ў шырокім храналагічным дыяпазоне. Да іх адносяцца такія, якія маюць назвы і пра якія існуюць паданні. Культавыя валуны звычайна маюць выемкі, знакі, надпісы і малюнкі. Так, на камені, які знаходзіцца ў лесе каля вёскі Каптаруны (Пастаўскі раён), высечаны крыж, і вада з выемкі лічыцца святой. Да культавага адносіцца і каменны крыж каля Камайскага касцёла. Яго адносяць да XVI стагоддзя.

Увогуле, у паазерцаў былі распаўсюджаны таксама культы дрэў, вады, крыніц. У часы хрысціянства каля гэтых мясцін ставілі крыжы, будавалі капліцы. На наш погляд, названыя артэфакты ўтрымліваюць адгалоскі міфаў нашых далёкіх продкаў, з'яўляюцца каштоўнасцямі і падлягаюць музеефікацыі. А для гэтага, у першую чаргу, неабходна іх дакументаванне, правядзенне маніторынгу стану і выкарыстання абазначаных помнікаў. Дарэчы, маніторынг можа праводзіцца і ў адносінах да іншых відаў гісторыка-культурнай спадчыны. Яго прадметам можа стаць: цэласнасць нерухомых помнікаў, культурных каштоўнасцей, захаванасць іх канструкцый, выконванне ўласнікам і карыстальнікам патрабаванняў ахоўных абавязкаў і ўмоў дамовы аб правядзенні рамонтна-рэстаўрацыйных работ.

Важную ролю ў музеефікацыі помнікаў народнай спадчыны адыгрывае працэс кансервацыі і рэстаўрацыі, якія дазваляюць захаваць помнік і яго гістарычны выгляд. На тэрыторыі Заходняга Паазер'я пэўная частка помнікаў гісторыі і культуры адрэстаўравана:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Базыльянскі манастыр, царква Раства Багародзіцы, Троіцкі касцёл, касцёл Ганны ў вёсцы Мосар, Азерская сядзіба, мемарыяльная калона ў памяць аб Канстытуцыі 3 мая 1791 года і інш. Але ў азначаным рэгіёне маецца яшчэ нямала культурна-гістарычных аб'ектаў, якія захаваліся і патрабуюць неадкладнай рэстаўрацыі і кансервацыі. Да іх ліку адносяцца Беразавецкі базыльянскі манастыр, палацава-сядзібны комплекс у вёсках Опса, Злота, Дрысвяты, Пагошча, палацава-паркавы комплекс у Лынтупах, капліца-пахавальня Друцкіх-Любецкіх у Манькавічах і інш. Аналіз рэстаўрацыйных работ сведчыць: у Беларусі рэстаўрацыйная служба толькі пачынае складвацца. На сённяшні дзень існуе толькі адна сапраўдная майстэрня «Мінскрэстаўрацыя», якая займаецца кансервацыяй і рэстаўрацыяй рухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей. Рэстаўрацыйныя аддзелы створаны толькі ў двух вядучых музеях краіны — Нацыянальным мастацкім музеі і Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі Камітэту па кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры пры Мінкультуры пажадана паспрыяць стварэнню рэстаўрацыйных аддзелаў пры ўсіх абласных музеях. У краіне, на жаль, не вядзецца падрыхтоўка прафесійных кадраў у галіне кансервацыі і рэстаўрацыі, што, безумоўна, адмоўна адбіваецца на справе захавання культурнай спадчыны, у тым ліку і Заходняга Паазер'я.

Немалаважнай праблемай захавання народнай спадчыны з'яўляецца ўдасканальванне заканадаўства, больш шырокае выкарыстанне вопыту Арганізацыі аховы сусветнай спадчыны пры ЮНЕСКА. Настаў час упарадкаваць працэс дэмузеефікацыі. У Заходнім Паазер'і існуе шмат сакральных аб'ектаў, якія дзейнічаюць па прызначэнню, але не маюць дзяржаўнага ахоўнага знака, не фінансуецца іх рамонт, што пагражае іх захаванню для будучых пакаленняў. Каб забяспечыць больш эфектыўную ахову, музеефікацыю і папулярызацыю гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны Паазер'я, патрэбна ўключыць яе ў праграмы агульнага планавання, ствараць адпаведныя службы, забяспечаныя сучаснымі сродкамі і штатамі. На наш погляд, наспеў час стварыць рэгіянальную комплексную праграму па захаванню і выкарыстанню гісторыка-культурнай спадчыны Заходняга Паазер'я, якая не толькі аб'яднае аб'екты спадчыны ў рамках дадзенай мясцовасці, але і стварыць спрыяльныя ўмовы для зберажэння і выкарыстання помнікаў культуры і прыроды ў цэлым.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Думаецца, што станоўчую ролю ў захаванні культурнай спадчыны могуць адыграць планы аховы, зберажэння і развіцця, у якіх павінны адзначацца ўмовы выкарыстання зямлі, будынкаў і абавязкі па падтрыманню іх у належным стане. У еўрапейскіх краінах такія планы ўключаюцца ў агульную сістэму планіроўкі і развіцця гарадоў і іншых тыпаў населеных пунктаў. У планах указваецца магчымае выкарыстанне гістарычных будынкаў і іх месца ў прыродным асяроддзі.

Галоўную ролю ў ахове і захаванні помнікаў гісторыі і культуры, безумоўна, адыгрываюць музеі. У Заходнім Паазер'і функцыянуе шэраг сапраўдных цэнтраў культуры. Да актыўных захавальнікаў культурна-гістарычнай спадчыны разглядаемага рэгіёну па праву можна аднесці раённыя краязнаўчыя музеі: Браслаўскі, Глыбоцкі, Мёрскі, Пастаўскі. Яны з'яўляюцца не толькі захавальнікамі помнікаў, але і транслятарамі культурнага вопыту беларускага народа. Аднак і ў дзейнасці названых музеяў маецца шэраг нявырашаных праблем. Не ўсе музеі маюць належныя ўмовы для разгортвання сваіх экспазіцый, вядзення навукова-фондавай дзейнасці. Музеі Паазер'я, дарэчы, як і большасць музеяў краіны, адчуваюць вострую патрэбу ў кадрах, маючых музеязнаўчую адукацыю.

*Літаратура і крыніцы*

1. Алексеев, В.П. Музееведение. Музеефикация. Культура / В.П. Алексеев // Вестн. музейн. комиссии. — М., 1990. — № 1. — С. 10—19.
2. Гужалоўскі, А. А. Музеі Беларусі (1918—1941гг.) / А. А. Гужалоўскі. — Мн.: Веды, 2002. — 130 с.
3. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць / Рэдкал.: С. В. Марцэлеў і інш. — Мн.: Веды, 1985. — 496 с.
4. Страчаная спадчына / Рэдкал.: Т.В. Габрусь, А. М. Кулагін і інш. — Мн.: Веды, 1998. — 350 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ